# Адкрываючы таленты

**XX Міжнародны конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні "Халі-Хало" адбудзецца ў Наваполацку з 15 па 16 лістапада.**

Гэты прэстыжны творчы праект на працягу многіх гадоў аб'ядноўвае маладыя таленты і спрыяе іх прафесійнаму развіццю. З кожным разам конкурс пашырае геаграфію. Сёлета на адборачны тур пададзена 142 заяўкі з гарадоў Беларусі, Расіі, Арменіі. Журы вылучылі 45 выканаўцаў ва ўзросце ад 8 да 16 гадоў, якія будуць змагацца ў фінале. Нягледзячы на юны ўзрост, у кожнага з іх за плячыма перамогі на міжнародных конкурсах, а ў некаторых — нават на папулярных тэлешоу.

Ацэньваць юных спевакоў будзе прафесійнае журы. У склад традыцыйна ўваходзяць сапраўдныя мэтры эстрады — беларускія і замежныя артысты, кампазітары, педагогі, арганізатары буйных музычных фестываляў. Сярод іх — папулярны спявак, музычны прадзюсар, фіналіст тэлепраекта "Голас", вакальны трэнер праекта "Фактар.by" Яўген Курчыч і адзін з самых запатрабаваных кампазітараў сучаснасці, стваральнік і кіраўнік арт-групы "Беларусы" Валерый Шмат. На працягу некалькіх сезонаў старшынёй журы з'яўляецца Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, дацэнт кафедры мастацтва эстрады Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ірына Дарафеева.

Гісторыя праекта ўпрыгожана яркімі імёнамі пераможцаў. У розныя часы ўладальнікамі гран-пры станавіліся маладыя выканаўцы з Магілёва, Мінска, Масквы, Ерэвана. Гэта Цімур Шышкоў, Ганна Трубяцкая, Мікіта Бялько, Ірына Круглік, Мілана Рэдчанка, Злата Рыжыкава, Ліліяна Садоўская, Макар Таранда, Амалія Сухан.

Сапраўдным падарункам для ўдзельнікаў і гасцей конкурсу стане канцэрт папулярнай беларускай і расійскай спявачкі, уладальніцы звання лаўрэата "Халі-Хало'95" Наталлі Падольскай. Арганізатары, сярод якіх Міністэрства культуры Беларусі, Віцебскі аблвыканкам і Наваполацкі гарвыканкам, упэўненыя: XX Міжнародны конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні "Халі-Хало" адкрые новыя яркія таленты, якія зробяць дастойны ўклад у культурны фонд нашай краіны і свету.